# «Бальнічны» — гэта пра студатрад



**Завяршыў сваю работу студэнцкі сэрвісны атрад на базе цэнтральнай раённай бальніцы. «Імпульс», як і два папярэднія атрады, пакідае пасля сябе станоўча зараджаны след.**

У гэтым мы пераканаліся, калі завіталі ў стаўбцоўскую паліклініку, дзе школьная і студэнцкая моладзь шчыравала на пасадах медрэгістратараў, санітарак, прыбіральшчыкаў тэрыторыі. Каму няма 16-ці, былі заняты няпоўны рабочы дзень. Іх работу не назавеш лёгкай, але са сваімі абавязкамі студатрадаўцы спраўляліся.




— Моладзь старанная, працавітая. Умее сябе паводзіць, — пацвердзіла старшая медсястра паліклінікі Людміла Хвясевіч.

Сезонных памочнікаў прынялі ў калектыве медыкаў з прыязнасцю, стварылі для іх належныя ўмовы працы. Дапамаглі не толькі асвоіцца, а і падбадзёрылі. «Цяжка было толькі першы дзень», — жартуюць члены «Імпульса». Ім да твару ўсмешка, а таксама беласнежнае спецадзенне, падагнанае да тоненькіх дзявочых фігурак.

У райцэнтры студатрады на базе ЦРБ пачалі працаваць упершыню за многія гады.

— На нашу прапанову з ахвотай адгукнулася галоўны ўрач бальніцы С. З. Глебка. Быў заключаны дагавор і сфарміраваны тры студэнцкія сэрвісныя атрады. Кожны дзейнічаў на працягу дзесяці дзён. Жадаючых трапіць у іх аказалася нямала. Першы атрад пачаў работу 23 ліпеня. Такім чынам, атрымалі працаўладкаванне 23 старшакласнікі гарадскіх школ, студэнты, — зазначае першы сакратар раённага камітэта БРСМ Анастасія Калодзінская.

У рэгістратуры нас сустрэла медрэгістратар і камандзір атрада «Імпульс» Дзіяна Шуцько. Дзіяна — не навічок у студатрадаўскім

руху. Была камандзірам і першага атрада на базе ЦРБ. Яна — будучы медык. Займаецца ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім каледжы і ўжо ў наступным годзе атрымае дыплом фельчара. У студэнткі, былой выпускніцы СШ № 2 г. Стоўбцы, былі канікулы.
— Вольнага часу дастаткова. Чаму б не папрацаваць? — даводзіла Дзіяна. Як і больш вопытныя работнікі рэгістратуры, яна старалася абслугоўваць наведвальнікаў хутка. Раніца — самы напружаны час у медрэгістратараў. «Чым магу вам дапамагчы?» — першай звярнулася Дзіяна да пажылой жанчыны з чаргі. У гэтым — і праяўленне павагі, увагі да старэйшага пакалення, і, так бы мовіць, індывідуальны падыход.
Не губляла часу і яе калега, член атрада Ульяна Асаёнак. З карткай пацыента яна не пайшла, а пабегла ў адзін з урачэбных кабінетаў. У гэтым — Ульянін характар. Заяўку ў студэнцкі атрад яна напісала яшчэ вясной, калі супрацоўнікі раённага камітэта БРСМ наведвалі СШ № 3. А пакуль чакала варыянтаў, на пачатку лета індывідуальна працаўладкавалася прыбіральшчыкам службовых памяшканняў у тэрытарыяльны цэнтр. Адпрацавала там месяц. «Зарабіла грошай, паспела і адпачыць», — па-даросламу разважае дзяўчына. У яе шматдзетнай сям’і ўсе прывычныя да працы.
У «Імпульсе» працавала і адзінаццацікласніца Паліна Міткевіч. Яна была ў першым атрадзе і без ваганняў згадзілася быць і членам трэцяга, калі адна з заяўніц у апошні момант адмовілася. Абодва разы выконвала работу санітаркі ў фізіятэрапеўтычным аддзяленні. «Мне было лёгка, таму што дапамагала пастаянная работніца — Л. У. Сайкоўская», — гаворыць Паліна. Дзеліцца, што заробленае ў студатрадзе хоча патраціць на набыццё новага камп’ютара.
Разам трымаюцца дзве сяброўкі — дзесяцікласніцы Аліна Вільнявец і Марыя Булаш. Неразлучныя яны і ў працы. «Праціраць пыл — справа манатонная, але разам нам не сумна», — шчабечуць дзяўчаткі.



у атрадзе працавалі і двое хлопцаў – Андрэй Руперт і Павел Хвасько. Іх накіравалі на правядзенне рамонтных работ у Цясноўскую амбулаторыю. Да мужчынскай працы хлопцы падрыхтаваныя, ды і прыходзяць адзін аднаму на выручку, калі што. Пасля работы ў студатрадзе Андрэй приступае да заняткаў у каледжы, а Павел, сёлетні выпускнік СШ № 3, пачынае студэнцкае жыццё ў ВНУ.

Настрой у членаў студатрада ўжо сапраўды нялетні. Пачынаецца новы навучальны год. Яны падкрэсліваюць, што «Імпульс» стаў для іх жыццёвай навукай, крокам да будучага выбару прафесіі. І сапраўды, прыкладам служыць камандзір другога сэрвіснага студатрада Анастасія Шышло. Паспрабаваўшы сябе медрэгістратарам, яна выбрала прафесію медыка – паступіла сёлета ў Віцебскі медуніверсітэт.

**Таццяна ПЯТКЕВІЧ**